# ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Кнігасховішча рэспубліканскай бібліятэкі імя В. І. Леніна ўсё больш папаўняецца новымі экземплярамі айчыннай і замежнай літаратуры. З Усесаюзнай кніжнай палаты сюды пастурае па аднаму экземпляру кожнай кнігі і часопіса, якія выдаюцца ў Савецкім Саюзе. Атрымлівае бібліятэка таксама і шмат замежных перыядычных выданняў.

Бібліятэка імкнецца своечасова інфармаваць сваіх чытачоў аб паступленні новых кніг. З гэтай мэтай тут створаны пастаянная выстаўка і чытальная зала новых кніг і перыядычных выданняў.

У зале ёсць вітрына бягучай бібліяграфіі, у якой размешчаны летапісы, інфармацыйныя бюлетэні і іншыя бібліяграфічныя выданні па розных галінах ведаў. Ёсць тут і картатэка новых паступленняў у бібліятэку СССР імя В. І. Леніна. Знаёмячыся з гэтай картатэкай і бібліяграфіяй, чытач можа атрымаць патрэбныя яму кнігі і часопісы на месцы або выпісаць іх па міжбібліятэчнаму абанементу з іншых бібліятэк краіны.